**ІДЭ́Я** мастацкая, аддаленае ўяўленне аб мяркуемым вобразе; асн. думка маст. твора, якая выяўляецца ўсёй яго структурай, адзінствам і ўзаемадзеяннем элементаў зместу і формы і з'яўляецца адной з перадумоў нараджэння маст. вобраза. Фарміруецца на аснове тыповых для эпохі маст.-эстэтычных катэгорый і авангардных маст.-вобразных пошукаў, патрэб, запытаў, маст. і эстэтычных густаў грамадства. І. маст. адлюстроўваецца ў маст. задуме твора, увасабляецца з дапамогай сродкаў выразнасці, уласцівых пэўнаму віду мастацтва, і замацоўваецца ў кожным канкрэтным творы праз сімвалізацыю. Мае варыятыўны характар выяўлення, прадвызначаны відам, жанрам маст. творчасці, выбарам сродкаў выразнасці. Актуалізацыя маст. І. ў соцыуме вызначаецца грамадскай свядомасцю культ.-гіст. эпохі (перыяду), кантэкстамі прасторы, часу, асяроддзя. Яна аб'ектывіруецца ў маст. форме.

*Ю.Ю.Захарына.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ